## Факт

### «ГЕАГРАФІЯ» ЭКСПАРТУ АДУКАЦЫІ

**Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у Беларусі навучаюцца 14,6 тыс. замежных студэнтаў з 92 краін свету.**

Найбольшая колькасць студэнтаў-замежнікаў прыехалі атрымліваць вышэйшую адукацыю ў Беларусь з Туркменістана (8191 чалавек), Расіі (1554) і Кітая (722 чалавекі). Таксама ў беларускіх ВНУ навучаюцца студэнты з Азербайджана, Таджыкістана, Украіны, Казахстана, Нігерыі, Ірана, Лівана, Літвы, Турцыі і іншых краін. Усяго ў Беларусі налічваецца 53 ВНУ. Падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй ажыццяўляецца па 15 профілях адукацыі, якія ўключаюць больш за 400 спецыяльнасцяў і напрамкаў спецыяльнасцяў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## Тарыфы

### ПАДАРАЖЭЛІ АЦЯПЛЕННЕ І ГАРАЧАЯ ВАДА

**У студзені адразу на 33% павялічыліся тарыфы на цеплавую энергію для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 20 студзеня 2016 года №32.**

Згодна з дакументам, тарыфы на цеплавую энергію для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння ўстаноўлены ў памеры 133 417 рублёў за 1 Гкал. Да гэтага 1 Гкал цеплавой энергіі для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння каштавала 100 088 рублёў. У прэс-службе Саўміна паведамляецца, што пастанова ўступае ў сілу з дня яе прыняцця і распаўсюджвае сваё дзеянне на адносіны, якія ўзніклі з 1 студзеня 2016 года.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## Спорт-тайм

# ТЫДЗЕНЬ ПАД ЗНАКАМ ВІКТОРЫІ

**Прадстаўніца нашай краіны паспяхова выступае на прэстыжным тэнісным турніры ў Аўстраліі, беларускія футбалісты дабраліся да фіналу Кубка развіцця, а айчынныя заўзятары ў мінулыя выхадныя атрымалі шанц убачыць галоўны трафей Кантынентальнай хакейнай лігі. Пра самыя актуальныя спартыўныя падзеі — у штотыднёвым аглядзе «Звязды».**

**1. Вікторыя Азаранка выйшла ў чвэрцьфінал адкрытага чэмпіянату Аўстраліі ў Мельбурне.** Для гэтага беларускай тэнісістцы прыйшлося абыграць чэшку Барбару Стрыкаву — 6:2, 6:4. У першым туры Вікторыя была мацнейшая за бельгійку Элісан Ван Эйтванк — 6:0, 6:0, затым упэўнена перайграла чарнагорку Данку Ковініч — 6:1, 6:2, а потым перамагла японку Наомі Асака — 6:1, 6:1.

У матчы за выхад у паўфінал Азаранка згуляе з нямецкай тэнісісткай Ангелікай Кербер.

— *Мне заўсёды падабалася гуляць з Кербер. Яна прымушае мяне папрацаваць. І я рыхтуюся да вельмі складанага матча, таму што яна вельмі стабільная і заўсёды змагаецца да канца. Я павінна буду паказаць усё, на што здольная, у гэтым матчы,* — адзначыла Вікторыя.

**2. Футбалісты юніёрскай зборнай Беларусі (U-18) занялі другое месца ў розыгрышы Кубка развіцця-2016.** У фінальным паядынку яны не змаглі перайграць аднагодкаў з Украіны, лік сустрэчы — 1:3.

Адзначым, што гэта ўжо трэці поспех украінскай зборнай на турніры ў Мінску. Галоўны трафей спаборніцтваў яны ўжо выйгравалі ў 2009 і 2012 гадах.

**3. У мінулыя выхадныя ў Мінску можна было ўбачыць галоўны прыз чэмпіянату Кантынентальнай хакейнай лігі — Кубак Гагарына.** Ганаровы трафей быў выстаўлены ў спецыяльнай зоне ў гандлёвым цэнтры «Замак» і сабраў каля сябе нямала аматараў хакея. Дакрануцца да кубка было немагчыма, а вось сфатаграфавацца — лёгка.

Нагадаем, Кубак Гагарына ўручаецца пераможцу плэй-оф Кантынентальнай хакейнай лігі, трафей выраблены з 19 кг серабра 925-й пробы. Звонку ён пакрыты пазалотай, па крузе ўпрыгожаны маленькімі шайбамі, на якіх выгравіраваны назвы камандаў-пераможцаў, а на спецыяльных таблічках — імёны і прозвішчы хакеістаў, трэнераў і кіраўнікоў клубаў, якія сталі ўладальнікам кубка.

**4. Шосты этап Кубка свету па біятлоне ў Антхольцы завяршыўся эстафетамі.** Сярод мужчын у гэтым відзе спаборніцкай праграмы наймацнейшымі сталі расіяне, у жаночай гонцы пераможцамі стала каманда Францыі. Мужчынская зборная Беларусі ў складзе Уладзіміра Чапеліна, Рамана Елетнёва, Дзмітрыя Абашава і Дзмітрыя Дзюжава заняла толькі 13-е месца. Беларускія дзяўчаты (Надзея Скардзіна, Ганна Сола, Дар'я Юркевіч і Ірына Крыўко) фінішавалі сёмымі.

Наступны, сёмы, этап Кубка свету па біятлоне пройдзе з 4 па 7 лютага ў канадскім Кенмеры.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

## «Еўрабачанне-2016»

# IVAN — фаварыт нацыянальнага адбору

На міжнародным песенным конкурсе «Еўрабачанне-2016» у Стакгольме нашу краіну прадставіць IVAN (Аляксандр Іваноў)

**За права выступіць на сёлетнім музычным спаборніцтве ў Швецыі ў фінале нацыянальнага адбору змагаліся дзесяць прэтэндэнтаў, а пераможцу вызначалі гледачы, тэлефануючы ці адпраўляючы паведамленні за тыя нумары канкурсантаў, чыя музыка ім прыйшлася даспадобы. Пасля паўгадзіннага галасавання канкурсанты здабылі наступныя балы: IVAN — 12, гурт NAPOLI — 10, Кірыл Ермакоў — 8, група NAVI — 7, Аляксей Грос — 6, Настасся Малашкевіч — 5, гурт THE EM — 4, Валерыя Садоўская — 3, гурт «Радыёхваля» — 2, Саша Захарык — 1.**



Падчас галасавання спачатку лідзіравала група NAPOLI, але ўсё ж запаветныя 12 балаў у выніку дасталіся IVANу. Пасля ў размове з журналістамі артыст сказаў: «Для мяне вялікі гонар прадстаўляць Беларусь на «Еўрабачанні». Дзякуй усім, хто за мяне аддаў свае галасы, дзякуй камандзе, якая са мной працавала і верыла ў мяне».

22-гадовы гамяльчанін Аляксандр Іваноў да адбору паспеў заявіць пра сябе ў расійскім песенным шоу «Галоўная сцэна», дзе стаў суперфіналістам. Пасля ўдзелу ў ім хлопец пачаў супрацоўнічаць з прадзюсарам Віктарам Дробышам, які і напісаў для вакаліста песню How to Fly («Як лётаць»). Да гэтага ў 2014 годзе Аляксандр выйграў усерасійскі музычны конкурс маладых выканаўцаў «5 зорак» (Ялта).

Сёлета конкурс у Швецыі плануе сабраць рэкордную колькасць удзельнікаў — 43 краіны. Паўфіналы «Еўрабачання-2016» пройдуць 10 і 12 мая, а выступленні фіналістаў чакаюцца 14 мая.

Дарэчы, у сувязі з працяглым лідзіраваннем у фан-рэйтынгу партала EUROFEST кампазіцыі «My Universe» ў выкананні NAPOLI яна прадставіць Беларусь на міжнародным анлайн-конкурсе «OGAE Second Chance 2016». Выбар прыняты ўнутраным рашэннем клуба OGAE Belarus. З прыемных навін таксама тое, што гурт «Радыёхваля» плануе ў хуткім часе парадаваць прыхільнікаў новай кампазіцыяй, якая будзе называцца «Гульня». Гісторыя працягваецца, песні пішуцца, і хочацца спадзявацца, што сёлетні адбор быў для сапраўдных талентаў толькі прыступкай да новых дасягненняў і перамог.

**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*



# Песня як сродак супраць крызісу

Арганізатары конкурсу заклікаюць краіны Еўропы аб'яднацца на музычным фронце

**«Come together!» — пад такім дэвізам пройдзе «Еўрабачанне» ў маі 2016 года ў Швецыі. Як адзначыў генеральны дырэктар шведскага тэлеканала SVT, «гэта як ніколі важна сёння для Еўропы — сабраць людзей разам і вылучыць тое, што нас аб'ядноўвае». Літаральна ўчора ў Стакгольме адбылася прэзентацыя лагатыпа і слогана конкурсу.**

Між тым са сваімі прадстаўнікамі на «Еўрабачанні» вызначылася менш за трэць краін-удзельніц сёлетняга еўравізійнага шоу. Адной з першых, дарэчы, стала Расія — яшчэ ў снежні было афіцыйна названа імя Сяргея Лазарава. А вось конкурсную песню расійскі бок дагэтуль не зацвердзіў.

Ужо назвалі сваіх музычных дэлегатаў **Албанія, Арменія, Беларусь, Бельгія, Грузія, Ірландыя, Мальта, Сан-Марына**, неўзабаве вызначацца таксама **Балгарыя, Венгрыя, Літва, Ізраіль**.

У лютым пройдуць паўфіналы нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне» ва Украіне. Нагадаем, сёлета гэта краіна вырашыла вярнуцца на конкурс пасля паўзы, звязанай са складанай унутрыпалітычнай і эканамічнай сітуацыяй. Адбор, на які было даслана каля 2000 заявак, узначаліў вядомы кампазітар і прадзюсар Канстанцін Меладзэ.

Дарэчы, прыблізная чарговасць выступлення ўдзельнікаў ужо вядомая. Учора прайшла папярэдняя жараб'ёўка, якая размеркавала краіны па паўфіналах. Так, наша краіна трапіла ў першую палову другога паўфіналу — гэта значыць, што пераможца нацыянальнага адбору IVAN, ён жа спявак Аляксандр Іваноў, выйдзе на конкурсную сцэну 12 мая. Кампанію, а разам з тым і канкурэнцыю Беларусі складуць Албанія, Аўстралія, Балгарыя, Бельгія, Данія, Грузія, Ізраіль, Ірландыя, Латвія, Літва, Македонія, Нарвегія, Румынія, Сербія, Славенія, Польшча, Украіна і Швейцарыя. У першым паўфінале, які пройдзе 10 мая, на аднаго канкурсанта менш. Спаборнічаць з імі будуць Азербайджан, Арменія, Аўстрыя, Боснія і Герцагавіна, Венгрыя, Грэцыя, Ісландыя, Кіпр, Малдова, Мальта, Нідэрланды, Расія, Сан-Марына, Фінляндыя, Харватыя, Чарнагорыя, Чэхія і Эстонія.

Цяпер у шведскай сталіцы, якая трэці раз выступае гаспадыняй «Еўрабачання», напоўніцу ідзе падрыхтоўка будучага маштабнага музычна-тэлевізійнага шоу. Дарэчы, яго з улікам эканамічнага крызісу арганізатары плануюць зрабіць яскравым і якасным, але прытым як мага больш танным — як мяркуецца, агульны бюджэт шоу не перавысіць 13,3 мільёна еўра. Пакуль жа прыхільнікі конкурсу з усяго свету імкліва раскупляюць квіткі «Еўрабачання» (кошт даступных для заказу білетаў на дадзены момант складае ад 11 да 52 еўра).

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О РЕАЛИЗАЦИИ НЕДВИЖИМОГО И ПРОЧЕГО ИМУЩЕСТВА ОАО «Барановичидрев» на аукционных торгах 09.02.2016 года

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Сведения об организаторе торгов, его место нахождения и контактные телефоны, факс и элек. почта** | Председатель ликвидационной комиссии Мищук А.М. ОАО «Барановичидрев», Брестская обл., г. Барановичи, п. Восточный, 3, тел. 8-029-6332490 vel.; (029) 2512009 МТС; факс (0163) 453392; mischuk_am@mail.ru |
| 2 | **Форма проведения первых повторных торгов- (турбина) и третьих повторных торгов- (объекты недвижимости) Дата, время и место проведения торгов** | Первые повторные торги (п.3.1) – турбина и третьи повторные торги в форме аукциона-(п.3) объекты недвижимости (по тексту – торги или аукцион) **09 февраля 2016 года в 14.00 по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. пос. Восточный, 3, административное здание, актовый зал** |
| 3 | **Сведения о предмете торгов, место нахождения предмета торгов, порядок ознакомления с ним и цена каждого ЛОТА в рублях Республики Беларусь, без учета НДС 20%. Цена снижена на 50% от первых торгов** | **Лот №1** – объект недвижимости, незавершенное капитальное строение, с инв. №110/U-111051, пл. 16 416, 3 кв.м, здание неустановленного назначения расположенное на земельном участке с кадастровым №141000000003001974 – стоимость – **6.799.361.500 рублей.** **Лот №2** – объект недвижимости, незавершенное капитальное строение, с инв. №110/U-110566, пл. 559,1 кв.м, здание неустановленного назначения расположенное на земельном участке с кадастровым №141000000003001974 – **460.222.000 рублей.** **Лот №3** – объект недвижимости, капитальное строение с инв. №110/С-110940, пл. 851,9 кв.м, здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – цех сушильных камер, расположенное на земельном участке с кадастровым № 141000000003001974 – **576.975.000 рублей.** **г. Барановичи, пос. Восточный, 3, ОАО «Барановичидрев»** |
| 3.1 | **Сведения о предмете торгов, место нахождения предмета торгов, порядок ознакомления с ним и цена каждого ЛОТА в рублях Республики Беларусь, без учета НДС 20%. Цена снижена на 10% от первых торгов Первые повторные торги** | **Лот № 4** – турбогенераторная установка ТГ 06С/04-Р13/4,0 (инв. №000027 – для выработки электрической энергии с дальнейшим использованием отработанного пара для технологических и отопительных нужд. Мощность – 600 КвТ. Частота вращения ротора-турбины 8000 об/мин. Генератора – 1500. Параметры трехфазного тока напряжение – В-400, частота Гц – 50. Масса – 12,56 т. Стоимость – **2.511.940.320 рублей.** **г. Барановичи, пос. Восточный, 3, ОАО «Барановичидрев»** |
| 4 | **Срок возможного отказа организатора от проведения торгов** | Организатор вправе отказаться от проведения торгов по любому из ЛОТОВ в срок не позднее 14.00 05.02.2016, проинформировав участников торгов, подавших заявление об участии в торгах, об отказе в их проведении |
| 5 | **Сумма шага аукциона** | 5% от начальной цены лота |
| 6 | **Начальная стоимость каждого лота – см. п 3 и п. 3.1** | **Установлена: в рублях РБ – без НДС 20%** |
| 7 | **Порядок уплаты цены предмета торгов победителем торгов** | Победитель торгов обязан оплатить предмет торгов в полном объеме в рублях РБ в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов |
| 8 | **Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка, необходимые реквизиты текущего расчетного банковского счета продавца, на который должна быть перечислена сумма задатка** | 10% от начальной цены лота в рублях РБ. Получатель платежа: ОАО «Барановичидрев», УНП 200299909; р/с 3012122616138 в ф-ле ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Барановичи. **Назначение платежа – задаток за участие в аукционе.** Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению |
| 9 | **Требования к участнику торгов** | Возмещение победителем торгов расходов по оценке, регистрации капитальных строений и иного имущества, а также по заключению и регистрации сделки купли-продажи и других расходов по проведению аукциона |
| 10 | **Место, дата и время начала и окончания приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов** | Заявление на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, в срок до 14 часов 00 минут 05.02.2016 г. организатору торгов председателю ликвидационной комиссии Мищуку А.М. по адресу: **225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. пос. Восточный, 3, ОАО «Барановичидрев».** Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в торгах |
| 11 | **Возмещение затрат на организацию и проведение торгов** | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам. Победитель аукциона обязан перечислить на расчетный счет продавца сумму фактических затрат в течение 5 дней со дня проведения аукциона |
| 12 | **Порядок оформления участия в торгах** | К участию в аукционе допускаются лица, подавшие организатору торгов в установленный в настоящем извещении срок заявление (с приложением необходимых документов) и внесшие в установленном порядке на указанный в настоящем извещении расчетный счет сумму задатка, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. **В день проведения аукциона перед его началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные номера** |
| 13 | **Критерии выявления победителя торгов** | Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Неявка на торги признается отказом от участия в торгах. **В случае признания аукциона несостоявшимся по какому-то из выставляемых ЛОТОВ в связи с подачей заявления на участие в нем только одним участником, предмет торгов может быть продан этому участнику при его согласии по цене торгов, увеличенной на 5%, а также участник обязан оплатить сумму затрат на организацию и проведение аукциона** |
| 14 | **Порядок оформления результатов торгов** | Победитель аукциона в день его проведения подписывает протокол о результатах аукциона по каждому из ЛОТОВ. Протокол подписывается в трех экземплярах всеми присутствующими членами комиссии по проведению аукциона и победителем аукциона. Протокол утверждается организатором аукциона в день его проведения |
| 15 | **Срок подписания договора купли-продажи** | После подписания копии платежных документов о перечислении затрат на организацию и проведение торгов между продавцом и победителем аукциона заключается договор купли-продажи предмета торгов. **Договор купли-продажи предметов торгов (ЛОТОВ) должен быть заключен не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона** |